# РЭЦЭНЗІІ

УДК 655.552:[929.52 Радзивиллы+303.423.4

## Новае аб Радзівілах – у музейную практыку

***Высоцкая Н. Ф. Радзивиллы. Несвиж. Замок.*** *Минск : Беларусь, 2014. [Кн. I]. 348 с. ; Мінск : Мастац. літ., 2014. Кн. II, ч. 1. 352 с. ; Кн. II, ч. 2. 352 с.*




Грунтоўнае даследаванне доктара мастацтвазнаўства, прафесара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Надзеі Фёдараўны Высоцкай, прысвечанае Радзівілам, Нясвіжу, замку, выдадзена на высокім палеаграфічным узроўні і ў розным аб'ёме: у адной і дзвюх кнігах. Аднак тэкставы змест іх не паўтараецца, хаця ілюстрацыйны матэрыял у пэўнай ступені супадае. На наш погляд, удалы прыём выкарыстаны ў першай кнізе, выпушчанай у выдавецтве «Беларусь», калі на развароце старонак прыводзяцца выявы замка і яго інтэр'ераў да 1939 г. і яны ж пасля рэстаўрацыі 1997–2012 гг.

Ужо ў назве кніг закладзены галоўныя мэты, якія паставіў аўтар: па-першае, удакладніць генеалогію рода Радзівілаў; па-другое, даказаць прыналежнасць мастацкіх твораў да збораў Нясвіжскага замка; па-трэцяе, высвятліць іх месцазнаходжанне ў канкрэтных інтэр'ерах замка.

У даследаванні выкарыстаны шматлікія крыніцы: 166 гравюр, выдадзеных у 1758–1759 гг. у Нясвіжы, фотаздымкі, планы, чарцяжы, акварэлі, паштоўкі, малюнкі, інвентары інтэр'ераў і інш. Задзейнічана шматлікая навуковая літаратура: ад манаграфій да энцыклапедычных артыкулаў. Нягледзячы на існаванне значнай колькасці работ, прысвечаных Радзівілам, аўтар слушна заўважае, што толькі часткова яны сістэматызаваны ў працах Л. Л. Сысоевай і Г. М. Кандрацьевай.

Для зацікаўленых у вывучэнні гісторыі роду Радзівілаў і іх рэзідэнцыі ў Нясвіжы, а да іх трэба аднесці і студэнтаў спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны», мае значэнне зварот аўтара да зробленага папярэднікамі. Да прыкладу, Н. Ф. Высоцкая піша,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што інвентары замка дазволілі польскаму навукоўцу Т. Бернатовічу выявіць змяненні замкавага ансамбля і выдзеліць іх этапы: 1582–1616, 1642–1650, другая палова XVII ст., каля 1750 г.; XIX ст. і XX ст. Паступова першапачатковыя пабудовы (да 1706 г.) ператвараліся ў адзіны цэльны ансамбль з трыма дварамі – вялікім парадным, гаспадарчым і зусім малым. Вызначана, што разбурэнні і пажары ў замку адбываліся ў 1654, 1659, 1667, 1683, 1688, 1706, 1812, 1906 і 2002 гг.

Комплексны характар даследаванне набывае шляхам уключэння ранейшых артыкулаў аўтара, прысвечаных некаторым уласнікам замка, пытанням рэстытуцыі яго каштоўнасцей. З артыкула пра Дамініка Радзівіла чытач атрымае ўяўленне аб культурных скарбах, якія знаходзіліся ў замку напярэдадні 1812 г., і пра іх лёс падчас вайны. З пратакола следчай камісіі вядома, што з лістапада 1811 г. Нясвіжскі маёнтак Д. Радзівіла, які парушыў прысягу, дадзеную цару ў 1804 г., і выступіў у 1811 г. з уласным войскам на баку французскага імператара, адпаведна імяннаму царскаму ўказу знаходзіўся пад секвестрам за казённыя даўгі і што ў замку знаходзілася каштоўнасцей на 200 млн злотых. Згодна з высновамі Н. Ф. Высоцкай, расійскімі генераламі было ў 1812 г. вывезена і затым здадзена ў Эрмітаж 359 прадметаў з Нясвіжскага замка. Частка іх, каля 33, была вернута ў замак у 1905 г. па просьбе тагачаснай гаспадыні замка, жонкі Антонія Радзівіла – Марыі дэ Кастэлян.

Высновы аўтара падмацоўваюцца копіямі дакументаў з архіва Эрмітажа. З іх вынікае, што ў Эрмітаж на працягу XIX ст. было перададзена больш за 700 прадметаў з Нясвіжскага замка. Напрыклад, можна даведацца, што ў Эрмітаж паступілі некалькі вельмі тонкай работы срэбраных келіхаў, ракавін, мадэляў караблёў, кубкаў, залатыя гатавальні, сталовыя гадзіннікі ў срэбранай аправе з пазалотаю і інш.

Несумненную цікавасць выклікаюць артыкулы і дакументы, пакладзеныя ў іх падмурак, аб лёсе Нясвіжскага замка і калекцыі пасля 1917 г. З артыкула Т. А. Карповіч, прыведзенага ў частцы другой (кн. II), вынікае, што згодна з вопісам, складзеным у верасні 1920 г., у замку знаходзілася 1555 прадметаў, з іх толькі 421 меў мастацкую каштоўнасць. Па ўмовах Рыжскага міру (1921) у Польшчу з 1927 г. па спецыяльным пагадненні былі перададзены нясвіжскія каштоўнасці (каля 50 прадметаў), якія папоўнілі калекцыі кракаўскіх музеяў.

Нельга не пранікнуцца пачуццём горычы, калі чытаеш прыведзеныя аўтарам матэрыялы аб лёсе нясвіжскай калекцыі ў 1939–1941 гг. У гэтыя два гады ў адносінах да яе праявіліся і неахайнасць, і тайнае выкраданне, калі камендант замка вывез «немалое число чемоданов в Минск». Хацелася б адзначыць амаль дэтэктыўную гісторыю, звязаную з крадзяжом з памяшканняў замка розных рэчаў: матрацаў, падушак, радыёлы, патэфона і інш. Аб разгортванні следства па дадзеных фактах падрабязна расказваецца ў прыведзеных матэрыялах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Каштоўным дакументам гэтага перыяду з'яўляецца вопіс маёмасці ад 6 кастрычніка 1939 г., у якім пазначаны 264 карціны і партрэты. Згодна з рашэннем Бюро ЦК КП(б)Б ад 13 студзеня 1941 г., маёмасць і каштоўнасці замка належала размеркаваць наступным чынам: бібліятэку і архіў перадаць у Акадэмію навук БССР; каштоўныя мастацкія карціны і скульптуры – у Карцінную галерэю БССР; рыцарскія даспехі, зброю і іншую маёмасць рыцарскай залы – Мінскаму гістарычнаму музею і кінастудыі «Савецкая Беларусь»; калекцыю паляўнічай залы – музею Белавежскага дзяржаўнага запаведніка ў Беластоку, касцюмы і мэблю – Вялікаму тэатру оперы і балета, БДТ-1, Дому работнікаў мастацтваў.

Н. Ф. Высоцкая мяркуе, што перадача каштоўнасцей з Нясвіжскага замка ў прыведзеныя ўстановы адбывалася са студзеня па 22 чэрвеня 1941 г. Аднак на пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў выніку хуткай акупацыі Мінска аказалася немагчымым эвакуіраваць музейныя калекцыі, у тым ліку і нясвіжскія. Яны былі вывезены ў Германію, а пасля заканчэння вайны знойдзены ў Берліне і перададзены ў музеі СССР. Некаторыя з нясвіжскіх каштоўнасцей у красавіку 1948 г. былі дастаўлены ў Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з Цэнтральнага сховішча музейных фондаў прыгарадных дварцоў Ленінграда. Аднак ужо ў 1950 г. 89 твораў, у тым ліку 73 партрэты Радзівілаў, былі перададзены Польскай Народнай Рэспубліцы. У 1950–1960 гг. рэстытуцыя ў Польшчу прадметаў з нясвіжскага збору ў Эрмітажы працягвалася.

Аўтар прыводзіць наступныя даныя: у музейных фондах Беларусі налічваецца 75 прадметаў з Нясвіжа, з іх 59 – у Мастацкім музеі; 14 – Гістарычным музеі; 1 – Музеі Беларускага Палесся, 1 – у Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі. Па цяперашні час яшчэ не знойдзены 113 партрэтаў з Нясвіжа. На думку Н. Ф. Высоцкай, перад навуковай і музейнай грамадскасцю стаіць задача выяўлення і сумеснага выкарыстання нясвіжскіх каштоўнасцей, якія знаходзяцца ў прыватных і дзяржаўных калекцыях замежных краін.

Такім чынам, кожная з кніг доктара мастацтвазнаўства, прафесара Надзеі Фёдараўны Высоцкай, прысвечаная Радзівілам, Нясвіжу і замку, раскрывае малавядомыя старонкі іх гісторыі, культурнага і мастацкага жыцця, паказвае складаны шлях станаўлення, разбурэння, аднаўлення радавога гнязда нясвіжскіх Радзівілаў. Прыведзены аўтарам разнастайны фактычны і ілюстрацыйны матэрыял можна актыўна выкарыстоўваць пры выкладанні многіх дысцыплін, напрыклад «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны», «Асновы рэстаўрацыі і кансервацыі», «Гісторыя архітэктуры», пры чытанні мастацтвазнаўчых і культуралагічных курсаў. Выданні, безумоўна, будуць карысныя для ўсіх, хто цікавіцца культурай і гісторыяй знакамітых родаў Беларусі.

**М. А. Бяспалая,**
доктар гістарычных навук, прафесар



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ